Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 37 (630). Wilnia, Niadziela 13 Kastryčnika 1935 h. Hod XI (XIX).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.

HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.

Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na pałhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, сябром гэтай партыі, сябром і прыхільнікам Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі і ўсяму беларускаму грамадзянству

КАМУНІКАТ

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі, развяжыўшы пісьменную прапанову Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі з жніўня месяца сёлета аб супрацоўніцтве і ўтварэньні супольнага супроцьфашыстаўскага фронту, пастанавіў выдаць і падаць да ведама Цэнтральнаму Камітэту КПЗБ, сябром гэтай партыі, а так-жа да ведама сябром і прыхільнікам БХД і ўсяму беларускаму грамадзянству наступны камунікат.

Наўперад Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту БХД сьцьвярджае, што БХД ня ўхіляецца ад супрацоўніцтва з такімі арганізацыямі, якія імкнуцца зьдзейсьніць постуляты беларускае нацыянальнае адраджэнска-вызвольнае думкі, імкнуцца да асягненьня політычнага ідэалу беларускага Народу — утварэньня на народным беларускім прынцыпе суверэннай беларускай дзяржавы.

Сучаснае палажэньне беларускага Народу ня толькі змушаець, але й забавязвае да такога супрацоўніцтва кожную беларускую нацыянальную арганізацыю.

Беларуская праблема ў межах польскай дзяржавы, у Заходняй Беларусі, ня вырашана. Патрэбы нацыянальныя і соцыяльныя беларускага Народу тут не заспакоены. Польская нацыянальная палітыка ў адносінах да беларускіх земляў накіравана на тое, каб закрапіць на гэтых землях, у Заходняй Беларусі, польскую рацыю стану, „polski stan posiadania."

Дзеля пацьверджаньня вышэйсказанага, прыводзім для прыкладу некаторыя факты.

1) На грунце эканамічна-гаспадарчым — не праведзена належна зямельная рэформа, але праведзена і далей праводзіцца польскае асадніцтва; праводзіцца палітыка крэдытаваньня польскіх эканамічных арганізацый і ўстаноў; беларускія гаспадарчыя арганізацыі і ўстановы ня маюць магчымасьці належна разьвівацца.

2) У галіне культурна-асьветнай — пасьля ліквідацыі беларускага школьніцтва—адбываецца полёнізацыя беларускае моладзі; зашкольная асьвета ў роднай мове, якая праводзіцца беларускімі культурна-асьветнымі арганізацыямі, напатыкае на непаканальныя труднасьці і ня можа належна разьвівацца.

2) У самаўрадавым жыцьці — ад імя насельніцтва краю выступаюць польскія асаднікі, абшарнікі і вучыцялі, а самаўрад знаходзіцца пад надзорам польскіх адміністрацыйных уладаў.

4) У палітычным жыцьці — польская конституцыя беларусам, як асобнай нацыі, асобнага права не абазначае, а выбарны закон агранічвае беспасярэднае выбіраньне паслоў у Сойм і не дае права галасаваць пры выбарах у Сэнат шырокім працоўным масам сялян і работнікаў, якія ня маюць вышэйшай асьветы або асабістай заслугі ў польскім гаспадарстве. Дзеля гэтага беларускае насельніцтва — сяляне і работнікі — ня мае магчымасьці пасланць беспасрэдна свайго прадстаўніцва ў польскі парлямант.

Вышэйсказаныя факты, хоць — дзеля зразумелых прычын—ня ўсе тут паданы — ілюструюць палажэньне беларускага Народу ў Заходняй Беларусі.

Адначасна-ж Прэзыдыюм Цэнтральн. Камітэту БХД сьцьвярджае, што беларуская праблема ня вырашана так-жа і ў Усходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад уладай камуністычнай партыі.

У Ўсходняй Беларусі маскоўскія камуністычныя ўлады праводзяць палітыку, накіраваную на закрапленьне там расейскай „рацыі стану." Усходняя Беларусь зьяўляецца прадметам расейскай палітычнай і культурнай экспансыі і эканамічнае эксплёатацыі. Дзеля прыкладу падаём некаторыя факты.

1) На грунце эканамічна-гаспадарчым — у Ўсходняй Беларусі праводзіцца прымусовая колектывізацыя, якая, будучы супярэчнай з векавой традыцыяй і псыхікай беларускага Народу, нясе яму новы прыгон. Пры гэтым з Беларусі камуністычныя ўлады высяляюць беларускае насельніцтва ўглыб Расеі, Сібіру, Туркестану і інш. далёкія краі, а адтуль прысылаюць чужынцаў. Побач з гэтым тыя-ж улады адбіраюць ад народу плады ягонай працы, а так-жа експлёатуюць прыродныя багацьці Беларусі і вывозяць у прамысловыя цэнтры Расеі. Гэта ўсё мае характар даўнейшай царскай колёніяльнай палітыкі адносна Беларусі.

2) У галіне культурна-асьветнай — камуністычныя ўлады забаранілі ўжываць у школах падручнікі, у каторых гаворыцца аб беларускім народзе, як самабытнай нацыі; вывелі з школьнага навучаньня нават гісторыю Беларусі; увялі правапіс супярэчны з духам і формамі беларускага языка, зблізжаючы гэты язык да расейскага языка; прымушаюць беларускіх пісьменьнікаў пісаць не на беларускія тэмы, але на „агульна саюзныя." Апроч гэтага, пад відам барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, праводзіцца жорсткае нішчэньне беларускае інтэлігенцыі і навуковых працаўнікоў, якіх высылаюць углыб Расеі і ў далёкія краі, каб не маглі працаваць для беларускай культуры і навукі. Прасьледуецца там рэлігія і нішчыцца рэлігійнае жыцьцё. Беларускае культурнае жыцьцё, праца і навука праводзяцца там згодна з дырэктывамі і пад наглядам маскоўскага камуністычнага цэнтру.

3) У самаўрадавым жыцьці — ад імя беларускага насельніцтва выступаюць сябры камуністычнай партыі, прысланыя з расейскіх губэрняў, а беларускае насельніцтва пазбаўлена права свабодных выбараў у самаўрады (саветы). Самаўрад у Ўсходняй Беларусі, як і ўсё грамадзка палітычнае, культурнае і эканамічнае жыцьцё, знаходзіцца пад загадам камуністычнай партыі і савецкіх адміністрацыйных уладаў.

4) У палітычным жыцьці — дагэтуль не далучаны да Савецкай Беларусі этнографічна-беларускія землі Смаленшчыны, Віцебшчыны, Чарнігаўшчыны, дзе праводзіцца поўная русыфікацыя беларускага насельніцтва, а на прасторы Савецкай Беларусі створаны камуністычнай уладай нацыянальна-польскі раён у Койданаўшчыне (цяпер „Дзяржыншчына"), дзе праводзіцца полёнізацыя беларускага насельніцтва.

Вышэйпададзеныя факты пераканаўча ілюструюць палажэньне беларускага Народу і тымбольш пабуджаюць да консолідацыі і аб'яднаньня беларускіх нацыянальных сіл.

БХД, імкнучыся да палепшаньня палажэньня беларускага Народу і рэалізуючы сваю праграму і ідэолёгічную плятформу,—паўтараем,— не адкідае, а наадварот — дэкляруе супрацоўніцтва з тымі арганізацыямі і партыямі, якія бароняць і ймкнуцца заспакоіць інтарэсы беларускага Народу, яго постуляты нацыянальна палітычныя, культурныя і соцыяльна-эканамічныя.

Адказваючы-ж Цэнтральнаму Камітэту КПЗБ на ягоную пісьменную прапанову з жніўня месяца сёлета, у справе супрацоўніцтва і ўтварэньня супольнага проціўфашыстаўскага фронту, Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту БХД ад імя цэлай арганізацыі заяўляе наступнае:

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту БХД адкідае прапазыцыю супрацоўніцтва з КПЗБ дзеля гэткіх прычын:

1) КПЗБ ня ёсьць самастойнай беларускай нацыянальнай палітычнай арганізацыяй, ня ёсьць і самастойнай арганізацыяй рэвалюцыйнай, бо бароніць дыктатарскі рэжым у Саветах; зьяўляецца яна экспозытурай маскоўскага камуністычнага цэнтру і як такая, дзеючы на абшарах Зах. Беларусі, праводзіць палітыку гэтага цэнтру, нязгодную з духам і патрэбамі беларускага Народу.

2) КПЗБ пашырае сярод беларускага Народу ідэолёгію дыамэтральна супярэчную да вызвольных народна-соцыяльных імкненьняў БХД. Камуністычная ідэолёгія ў сваіх філёзофічных асновах, у палітычных, культурных, гаспадарчых тэорэтычных адносінах і мэтаімкненьнях (палітычны і культурны інтэрнацыяналізм і прымусовая колектывізацыя) — супярэчная да ідэолёгіі і мэтаімкненьняў, якія рэпрэзэнтуе і пашырае БХД.

БХД, стоячы на грунце ідэалістычнага сьветапагляду, адкідае сьветапагляд матэр'ялістычны іймкнецца да асягненьня палітычнага ідэалу—суверэннае беларускае дзяржавы ў этнографічных граніцах Беларусі, з грамадзка-гаспадарчым ладам пабудаваным на прынцыпе прыватнай уласнасьці, з агранічэньнем гэтага прынцыпу на карысьць грамадзкую, і з магчымасьцю ўвядзеньня дабравольнага гаспадарчага колектывізму. БХД імкнецца да стварэньня беларускай нацыянальнай эканомікі і культуры.

КПЗБ, выступаючы проціў дыктатуры фашыстаўскай, прызнае і падтрымлівае дыктатуру пролетарыяту, — БХД — проціў усякай дыктатуры, а гэтым самым і проціў дыктатуры пролетарыяту.

3) Білянс дзейнасьці КПЗБ адзначаецца ад'емнасьцю і шкоднасьцю для беларускага адраджэнскага руху і беларускіх працоўных гушчаў Зах. Беларусі. КПЗБ сярод гэтых гушчаў пашырала дэмагогічную думку, што ў СССР усе народы, у гэтым ліку і Беларусы, здабылі нацыянальнае і соцыяльнае вызваленьне і што там існуе дабрабыт і шчасьце для працоўнага чалавека, — тады, калі фактычна існуе там няволя народаў, у гэтым ліку і беларускага, дзяржаўна-бюрократычны капіталізм, эксплёатацыя і поўная няволя чалавека і ягонай думкі. — КПЗБ прамоўчывала факт маскоўскае палітычнае і культурнае экспансыі ў Усходняй Беларусі, экспансыі, якая адбывалася і адбываецца коштам паступовага нішчэньня праяваў беларускай палітычнай думкі, беларускай нацыянальнай культуры і эканомікі.—КПЗБ прамоўчывала факты жорсткае распраравы маскоўскіх камуністычных уладаў над беларускімі культурнымі работнікамі ў Усходняй Беларусі, прамоўчывала жудасныя факты масавай высылкі беларускага сялянства ў далёкія краі СССР, затое, што гэтае сялянства супраціўлялася колектывізацыі і агулам усей бальшавіцкай палітыцы ў Усходняй Беларусі.—Беларускія працоўныя гушчы Зах. Беларусі, дэзорыентаваныя агітацыяй БПЗБ, трацілі веру ў свае сілы, у сілу свайго творчага духа, аслабляліся ў барацьбе за свае нацыянальныя і соцыяльныя правы. Пад уплывам гэнай-жа агітацыі, тыя-ж гушчы да некаторай меры сталіся пасыўнай масай, з недаверам адносіліся да беларускіх нацыянальных арганізацыяў і беларускіх дзеячоў, якіх лаялі і зьневажалі камуністы. — КПЗБ узрывала беларускія культурныя ўстановы і арганізацыі. — У выніку работы КПЗБ, апроч вышэйапісанай шкоды, Беларускі народ у Зах. Беларусі шмат пасьвяціў ахвяраў у людзях — многія беларусы, якіх КПЗБ уцягнула ў работу дзеля пашырэньня бальшавізму, пакараны доўгімі гадамі вастрогу і іншымі карамі.

Прыпамінаем аб шкоднасьці КПЗБ для беларускага Народу дзеля таго, што й гэты мамэнт зьяўляецца перашкодным да супрацоўніцтва БХД з КПЗБ.

З вышэйпададзенай адмоўнай мотывацыі нашага становішча да справы супрацоўніцтва і ўтварэньня супольнага з камуністамі проціўфа-

шыстаўскага фронту — прапанова КПЗБ у гэтай справе зьяўляецца незразумелым для нас выступленьнем. Партыя, якая нядаўна так паніжала добрае імя і работу БХД, адзінай у межах Польшчы сільнай ідэолёгічна і арганізацыйна сцэмэнтаванай беларускай палітычнай арганізацыі, — цяпер зварачваецца да гэтай апошняй з прапановай супрацоўніцтва! — Гэткае выступленьне ў справе супрацоўніцтва і ўтварэньня супольнага проціўфашыстаўскага фронту зьяўляецца не самастойным зваротам КПЗБ, выцякаючым з сучасных патрэб беларускага Народу, але выкананьнем наказу сёлетняга 7-га зьезду Камінтэрну, які, пад прымусам напружанага міжнароднага палажэньня і слабай ролі камуністаў у сьвеце, загадвае камуністам за межамі СССР супрацоўнічаць з нацыянальнымі арганізацыямі нефашыстаўскага характару.

Можна было-б гаварыць аб супрацоўніцтве тады:

1) калі камуністычныя ўлады далучаць да Савецкай Беларусі етнографічна беларускія землі Смаленшчыны, Віцебшчыны, Чарнігаўшчыны, а так-жа скасуюць на этнографічна-беларускіх землях — у Койданаўшчыне — нацыянальна-польскі раён;

2) калі бальшавіцкія ўлады прызнаюць у Ўсходняй Беларусі права для беларускай нацыянальнай культуры ня толькі для нацыянальнай сваей формай, але для нацыянальнай і ў зьмесьце, гварантуючы рэалізацыю гэтага права;

3) калі ў Усходняй Беларусі: а) спыніцца прымусовая колектывізацыя і высяленьне беларускага жыхарства з роднага краю, якое праводзіцца з прычыны ягонай апорнасьці супроць гэнай колектывізацыі, б) дасца магчымасьць вярнуцца на бацькаўшчыну ўсім дасюль выселяным беларусам;

4) калі ў Усходняй Беларусі будзе спынена дыктатура і ўсе грамадзяне будуць прызнаны роўнапраўнымі, а так-жа будзе загварантавана поўная свабода выбараў ва ўсе савецкія ўстановы;

5) калі забясьпечыцца там свабода палітычная, грамадзкая і рэлігійная.

Прэзыдыюм Цэнтральнага Камітэту Беларускай Хрысьціянскай Дэмократыі зварачвае пільную ўвагу сяброў БХД датасавацца да сказанага ў камунікаце, і ў парадку арганізацыйнай дысцыпліны наказвае не ўваходзіць у ніякія сувязі з КПЗБ. Адначасна-ж прэзыдыюм ЦК — БХД прыпамінае сябром БХД аб абавязках працы ў граніцах статуту і інструкцый БХД.

Прэзыдыюм ЦК—БХД зварачвае ўвагу так-жа агулу беларускага грамадзянства на сучаснае палажэньне беларускага Народу, на патрэбу консолідацыі беларускіх нацыянальных сіл і працы на карысьць Бацькаўшчыны.

ПРЭЗЫДЫЮМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЙ ХРЫСЬЦІЯНСКАЙ ДЭМОКРАЦЫІ.

(—) *Ад. Клімовіч*, старшыня
(—) *М. Дварэцкі*, віцэ-старшыня
(—) *Я. Малецкі*, сябра
(—) *Я. Шутовіч*, сакратар
(—) *Я. Пазьняк*, скарбнік.

Вільня, 25 верасьня 1935 г.

Аб навучаньні дзяцей у роднай мове

З гледзішча прыроднага і пэдагагічнага, пачаткавае навучаньне дзяцей павінна быць у роднай мове. Гэтак кажуць пэдагогі і гэтак вучаць дзяцей ва ўсім культурным сьвеце. У нас — у Зах. Беларусі — беларускіх дзяцей вучаць у школах папольску, а праваслаўнай рэлігіі рускія папы вучаць беларускіх дзяцей у школах у большасьці парасейску.

Парасейску вучылі ў школах праваслаўнай рэлігіі беларускіх дзяцей, між многімі іншымі, у Куранцы, Вялейскага пав., поп Сементовскій і ў Браславе — поп Васілевскій. Гэтых папоў школьныя ўлады — паветавыя школьныя інспэктары — надовячы звольнілі з школы і паведамілі аб гэтым віленскую праваслаўную Кансысторыю; матывуюць гэныя ўлады звальненьне іх тым, што яны (папы) не зважаючы на наказ у леташнім школьным годзе, каб навучалі рэлігіі ў роднай мове вучняў, упорыста вучылі парасейску; пры гэтым школьныя інспэктары паясьняюць, што роднай мовай вучняў у тых паветах ёсьць мова беларуская, а не расейская.

Сапраўды, новае гэта зьявішча, што польскія школьныя ўлады зварочваюць увагу рускім папом, што беларусы — гэта ня „те-же русскія“ і што трэба беларускіх дзяцей вучыць рэлігіі пабеларуску.

Правільна і справядліва! Але вось, каб гэтыя правільнасьць і справядлівасьць школьныя ўлады пашырылі больш — на ўсім абшары Зах. Беларусі, каб тут навучаньне беларускіх дзяцей агулам адбывалася ў роднай мове — пабеларуску!

п.

А. Пінчук

Сучаснае палажэньне беларускай вёскі

XIII. Як аджыўляюцца беларускія сяляне.

Справа аджыўляньня насельніцтва належыць да найважнейшай. Ад якасьці аджыўляньня залежыць будучыня народу. Пасьля дрэннага і паўгалоднага аджыўляньня народ пачынае хварэць прадчасна старэе і вымірае. Калі з гэтага боку падыйсьці да ацэнкі сучаснага палажэньня беларускай вёскі, то й тут мы апынімся ў жудасным палажэньні.

З прычыны агульнай галіты нашае сялянства, у большасьці выпадкаў, пазбаўлена самых элемэнтарных аджыўных прадуктаў. Ёсьць такія ваколіцы, дзе жытні хлеб спажываецца ў вельмі агранічанай колькасьці.

Статыстыка даводзіць, што ўся Польшча ў суцэльнасьці спажывае жыта і пшаніцы найменш ад усіх іншых эўрапэйскіх краёў, што-ж датычыць нашага Краю, то ён стаіць на апошнім месцы ў параўнаньні з польскімі ваяводзтвамі.

Палажэньне катастрафальна пагаршаецца ў сувязі з сыстэматычнымі галадоўкамі, прычына якіх палягае на нерацыянальным аграрным ладзе, пануючым у нас.

Падчас гэткіх галадовак страшэнна разьвіваюцца розныя хваробы, каторыя покатам кладуць нашае сялянства, асабліва-ж дзяцей.

Дрэннае аджыўленьне, а ў большасьці выпадкаў пастаяннае недаяданьне і голад, між іншым, вядуць і да таго, што вясковая моладзь ня мае здароўя, якое павінна быць нармальным у моладзі.

З гэтай прычыны штораз больш зьяўляецца „бракуноў“, якіх не прыймаюць у войска.

Каб уявіць сабе гэтае жудаснае палажэньне, якое стварылася ў беларускай вёсцы, з гледзішча аджыўленьня, — трэба затрымацца тут на адным аджыўчым артыкуле — гэта цукры, каторы, як даводзіць навука, зьяўляецца неабходна патрэбным для людзкога арганізму.

Між іншым, паводле колькасьці спажыванага цукру азначаецца ступень заможнасьці насельніцтва.

Статыстычныя дадзеныя за 1930—33 г. кажуць у гэтай цікавай для нас справе наступнае.

У той час, як на 1 жыхара Даніі прыпадала 58,5 кілё цукру ў год, на 1 ангельца 47,9 кілё, на 1 чэха-славака 26,1 кілё., на 1 жыхара Польшчы ўсяго толькі 9,8 кілё.

У 1934 г. гэты цукровы „паёк“ абнізіўся ў нас да 8,9 кілё і будзе абніжацца далей, дзякуючы агульнай галіцэ і, ня гледзячы на тое, што польскім цукрам кормяць у Англіі сьвіней.

Было-б яшчэ паў-бяды, калі-б і на беларускага селяніна прыпадала тая колькасьць цукру, якая зьяўляецца сярэдняй для ўсей Польшчы.

Справа тут стаіць горш, а гэта з тэй прычыны, што г. зв. „Ziemie wschodnie“, паводле статыстычных аблічэньняў, спажываюць цукру найменш.

Тут на 1 жыхара прыпадае ўсяго толькі 4,3 кілё ў год. Узяўшы пад увагу, што галоўным спажыўцом цукру зьяўляюцца ў нашым краі палякі і жыды — на долю беларускага селяніна нічога не застаецца. Пададзеныя вышэй лічбы вельмі красамоўна сьведчаць нам пра той матарыяльны ровень, у якім апынуўся наш Край.

Калі-б мы уважна разгледзілі статыстыку спажыцьця іншых яшчэ прадуктаў, то пераканаліся-б, што спажыцьцё нашага сялянства значна меншае ў параўнаньні з усімі эўрапэйскімі народамі.

Здавалася-б, што такі распаўсюджаны і танны „прысмак“, як бульба, — і той спажываецца нашым сялянствам у вельмі агранічанай колькасьці.

Калі статыстыка і паказвае, што на долю беларусаў прыпадае вялікая колькасьць бульбы, то трэба не забывацца, што нашае сялянства найбольш скармлівае яе сьвіньнямі, які змушана потым за безцан прадаваць, каб аплаціць падаткі і купіць дарагой цаной неабходныя гаспадарчыя прылады.

Гэткім чынам, нават звычайнай бульбы і тэй беларускі селянін есьці ўдоваль ня можа.

Сучасны эканамічны і соцыяльны лад зьвёў селяніна на апошняе месца грамадзкай драбіны, вымагаючы ад яго нялюдзкай працы і не даючы яму абсалютна нічога, што мае сучасны культурны і адукаваны сьвет.

Нават з гледзішча аджыўленьня, сяляне, асабліва-ж беларускія, ня маюць таго элемэнтарнага, што павінна мець людзкая істота.

З гэткага палажэньня, якое стварылася ў нас і якое доўга трываць ня можа, мы прадбачым вельмі сумныя насьледкі, як для той „культуры“, так і ўсіх арганізатараў сучаснага грамадзка-эканамічнага ладу, якія зусім ня дбаюць пра палепшаньне палажэньня сялянства, якое становіць найбольшую клясу ў нашым Краю і якое мазольнаю рукою корміць каго патрэба і каго нават не патрэба...

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы! — Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

Biełaruskaja relihijnaja prablema

U numary 29 „B. Krynicy“ my zrabili karotki ahlad časapisu „Iskry Skaryny“, jaki nieperyjadyčna wychodzić u Prazie Českaj i źjaŭlajecca jak-by orhanam tej častki biełaruskaj emihracyi, jakaja apynułasia ŭ Čechasławakii. Čytajučy ŭwažna hety časapis, wynosim prakanańnie, što praskija biełarusy pilna sočać za biełaruskim žyćciom na Baćkaŭščynie, jak u nas tak i pad sawietami, pilna źbirajuć fakty i prajawy hetaha žyćcia. Dumajem, što sposab hledžańnia na biełaruskaje žyćcio tych biełarusaŭ, jakija adarwany ad rodnaha kraju, budzie cikawy dla mnohich našych čytačoŭ — i dziela hetaha pišam hety artykuł. Pišam jaho tak-ža dziela taho, što redka chto z našych prawincyjanalnych čytačoŭ mieŭ abo budzie mieć mahčymaść pračytać hety časapis, a chacieŭ-by zaznajomicca z tym, što ŭ im napisana i pasłuchać krytyčnych zaŭwah.

* * *

Na pieršym miescy „Iskraŭ Skaryny“ staić artykuł pad zah.: „Adwiečny šlach — heta jość šlach Skaryny“. U hetym artykule, niepadpisanym, značycca, wyšłym z-pad piara redakcyi, aŭtar razważaje ŭsie złybiady, jakija spatykajuć biełaruski narod u jaho adradženskaj padarožy z pryčyny padziełu na prawasłaŭnych i katalikoŭ. Pry hetym aŭtar śćwiardžaje, što „katalictwa i prawasłaŭje na Biełarusi, jak formy relihijnaha kultu, jość nanosnyja i zusim čužyja biełaruskamu narodu“, što hety narod, choć jon jość pa formie relihijnaha kultu katalicki i prawasłaŭny, to jon u sapraŭdnaści jość ani katalicki, ani prawasłaŭny, taksama jak byŭ i Skaryna. Dyk aŭtar zaklikaje da stwareńnia swaje ŭłasnaje biełaruskaje nacyjanalnaje formy relihijnaha kultu. Jakaja maje być heta forma — aŭtar nie padaje, ale z niekatorych skazaŭ možna zrabić wywad, što aŭtar choča abapiorci nowy relihijny kult na narodnych wierawańniach i abradach i kaža, što „Biełaruski narod maje swaju narodna-tradycyjnuju formu relihijnaha kultu; najaŭna heta bačymo pry ŭsich narodnych uračystaściach“.

Z hetaha widać, što aŭtar adkidaje i katalictwa i prawasłaŭje i prapanuje wiarnucca da daŭniejšych bližej nieaznačanych abradaŭ. U hetaj prapazycyi jość biazsumliŭna ŭpływ siońniašniaha hitleryzmu, jaki wywodzicca z Niamieččyny, dzie ideolohi „rasyzmu“ adkidajuć i pratestantyzm i katalictwa, a budujuć fundamant pad rasysckuju ideolohiju ŭ formie daŭniejšaha pahanskaha kultu. Ale pobač z hetym upływam jość jašče ŭ praskich biełarusaŭ tuha za niejkaj ahulna-narodnaj biełaruskaj syntezaj, jakaja-b spyniła adwiečnaje chistańnie biełaruskaj dušy pamiž uschodam i zachadam i dała-b hetaj dušy mocnuju asnowu ŭ formie adzinaj relihii. Treba skazać ščyra, što hetuju tuhu adčuwaje kožny biełaruski patryjot i ŭ swaich dumkach rodzić takija ci inšyja plany stwareńnia adzinaj relihii — abo skasawańnia jaje zusim...

Takim paradkam u apošnich časoch pasiarod biełaruskich dziejačoŭ paŭstali takija prajekty:

1) skasawać zusim usiakuju relihiju i zbudawać biezrelihijnaje hramadzianstwa (kamunistyčny kirunak);

2) złučyć prawasłaŭje i katalictwa ŭ formu relihijnaj unii, kab kataliki pryniali ŭschodni (prawasłaŭny) abrad, a prawaŭnyja zachodnija (katalickija) dohmaty (unijacki kirunak);

3) stwaryć niejkuju nowuju formu relihijnaha kultu, apirajučysia na daŭniejšych i sučasnych wierawańniach i abradach biełaruskaha narodu (nazawiom heta „praskim“ kirunkam).

Pierachodziačy da krytyki kožnaha z hetych kirunkaŭ, my pawinny adznačyć, što pieršy (kamunistyčna-materjalistyčny) kirunak nia wydziaržyć sproby na daŭžejšuju metu. Bo kožnamu wiedamaj jość rečaj, što ŭ narodzie jość niejki relihijny mistycyzm, niejkaje šukańnie ideałaŭ i asabistaha ščaścia, kali ŭžo nia ŭ hetym žyćci, to ŭ budučym. Hety relihijny mistycyzm zaŭsiody wyliwajecca ŭ niejkija formy, bo pačućcio biaz formy isnawać nia moža. Pryrodnaja relihijnaść našaha narodu ŭziata ciapier u formy ŭschodniaha chryścijanstwa (prawasłaŭja) i ŭ formy zachodniaha (katalictwa). Jakaja forma bolej padychodzić da dušy našaha narodu: ci mistyčnaja forma ŭschodu, ci praktyčnaja zachadu — my tut hadać nia budziem, śćwiardžajem tolki fakt, što hetyja formy isnujuć i što jany padzialili dušu našaha narodu i nawučyli jaje chistacca pamiž uschodam i zachodam (tak jak chistaŭsia Skaryna, jaki byŭ spačatku prawasłaŭnym — Jurym, a potym katalikom Franciškam). Nad hetym padziełam i nad hetym chistańniem i sumujuć ciapier lepšyja syny našaha narodu.

Litoŭcy ab polskich historykach

17—20 wieraśnia sioleta ŭ Wilni adbyŭsia VI ahulny zjezd polskich historykaŭ. Z hetaj pryčyny „Viln. Ryt." z dn. 21.IX u stačci pad charaktarnym zahałoŭkam „Dziaržaŭna-wučony, ci wučona-dziaržaŭny" miž inšym piša:

— „U litoŭskaj historyi apošnim časam stałasia źmiena. Na arenie histaryčnaj nawuki pajawilisia maładyja litoŭskija wučonyja i, uzbroiŭšysia ŭ šyrokuju erudycyju, daśledziŭšy prad tym usie histaryčnyja matarjały, pačali papraŭlać toje, što polskija historyki praz doŭhija hady psuli. Kali kažam „psuli", dyk majem na dumcy chitra schawanuju polskimi historykami tendencyju wyjaśniajučy ŭsie histaryčnyja fakty na karyść palityki. I sapraŭdy. Nijakija historyki nia jość tak tendencyjnyja, jak polskija historyki, daśledžwajučyja minuŭščynu Litwy. Pokul ab litoŭskim nacyjanalnym adradžeńni było cicha, u pracach polskich historykaŭ minuŭščyna Litwy była duža pryhožaja. Ale kali Litwa pačała baraćbu za swaje prawy, dyk polskija historyki prosta ŭ wačach uzlalisia „rewidawać" swaje pahlady na minuŭščynu i tady ŭzmocnienym tempam pačałasia čeść dla unii.

Nowy kurs polskich historykaŭ što da minuŭščyny Litwy ŭsciež rabiŭsia bolš tendencyjny. A kali 1918 h. 16 lutaha litoŭski narod praz swaich pradstaŭnikoŭ zajawiŭ, što jon na ŭsich unijach stawić kryžyk, — polskija historyki jašče bolš zakratalisia i ad taho času panapiswali cely rad tendencyjnych knihaŭ ab minuŭščynie Litwy. U hetych knihach z chwalboj składalasia słowa „unija" na ŭsie łady. Na ščaście hety „wučony" nowaha žyćcia prajaŭ, litoŭcaŭ nia dziwić. Mała taho. Litoŭcaŭ zaachwočwaje da kontrataku. Pieršyja šahi hetaha nastupu ŭžo bačym i prakonwajemsia, što ŭsie polskija historyki, wyjaśniajučyja fakty z historyi Litwy, naciahnuty na ŭnijny kapył, tendencyjnyja. Rasšyfrawańnie polskich historykaŭ nia jość im pryjemnaje i dziela hetaha ničoha dziŭnaha, što prywyčnyja „unijaŭ" wyjaśnialniki nie škadujuć litoŭskim wučonym iraničnych uwah.

Adnak adnačasna polskija historyki wiedajuć, što kali raniej nie prakanali litoŭcaŭ swaimi tendencyjnymi pracami, dyk tym bolš ciapier nie prakanajuć iraničnymi ŭwahami. Tut treba niečaha bolš. Dyk što rabić? Doŭha dumali, pokul zdaryłasia nahoda jašče raz (wierym, što heta budzie ŭžo apošni raz) prypomnić hetym uporystym litoŭcam, što minuŭščyna, heta, bačycie, jość škoła žyćcia, što heta jość hodnaja pašany tradycyja, što „paniedzieju, kochajmy się" i tak dalej i jašče raz tak dalej. Ale jakaja-ž heta nahoda? A 550-lećcie padpisańnia ŭ Krewie unii. Ličba niezakruhlenaja, ale nahodu možna wykarystać, a tymbolš, što litoŭskija historyki nia dremiać: staranna daśledžwajuć usie isnujučyja krynicy, wydajuć wučonyja knihi i prosta niepieramožnymi histaryčnymi arhumantami wykazwajuć tendencyi polskich historykaŭ. Značycca, mament duža pawažny. A kali da hetaha dadadziom niekatoryja palityčnyja abstawiny, dyk budzie susim jasna, čamu staronniki adnaŭleńnia unii pastanawili wykarystać uspomnienuju nahodu. Najbolš padchadziačym miestam, jasna, źjaŭlajecca Wilnia. Tut možna zademanstrawać swaje wučonyja siły, možna ŭ uračystych pramowach šmat razoŭ uspomnić słowa Litwa, možna ŭ wydanym zborniku referataŭ prypomnić „niaŭdziačnym" litoŭcam, što im zdabyć niezaležnaść „pamahli" palaki"... —

Hetak polskija wučonyja adnosiacca da historyi Litwy. Hetak sama adnosiacca jany i da historyi Biełarusi. Nia lepšyja ahulam da nas tak-ža i rasiejskija historyki. Ščyruju praŭdu jak ab Litwie litoŭskija wučonyja, tak ab Biełarusi mohuć wydabyć na świet ahulam haworačy tolki biełaruskija wučonyja.

P. Łuhanowič.

Wajna ŭ Afrycy i Liha Narodaŭ.

Wajna ŭ Afrycy, jak my padawali ŭ prošłym numary, užo pačałasia. Italija napała na Abisyniju i pačała zajmać abisynskija ziemli. Italijancy ŭžo zabrali abisynskija miesty Aduu i Adigrat, u abaronie jakich mocna stajali abisynčyki i zajadła bilisia z italijancami; zabitych pad Adua ličać dziesiatkami tysiač — mnoha zabitych abisynčykaŭ, šmat pałahło i italijancaŭ.

Słowam, wajna Italii z Abisynijaj pačałasia i šyrokim frontam; u niekatorych miascoch frontu pabiwajuć italijancaŭ abisynčyki.

Abisynskimi zbrojnymi siłami kamanduje turecki hienerał, jaki ŭ suświetnaj wajnie ŭmieła baraniŭ Dardanelskaha praliwu. Hety hienerał zajawiŭ, što italijancam zawajawać Abisynii nia ŭdasca — italijancy nia wytrymajuć sprahi, a abisynskaja wada pamoža abisynskaj armii zwajawać italijancaŭ: italijancy ad tamašnaj wady pachwarejuć na malaryju.

Hetaj wajny Italija aficyjalna nie pryznaje jašče za wajnu, a tolki sporam. A heta tamu, — kab nia pryznacca da narušeńnia dahaworaŭ Lihi Narodaŭ, jakoj Italija i Abisynija źjaŭlajucca siabrami; — jak i inšyja dziaržawy, Italija zabawiazałasia, što sporaŭ z druhimi dziaržawami wajnoj wyrašać nia budzie. Dziela hetaha italijanska-abisynskaja wajna sapraŭdy „nieaficyjalnaja:" hetyja dziaržawy adna druhoj wajny jašče nie abjawili. Adnak huk harmat, tresk kulamiotaŭ, uzrywy bombaŭ, dziesiatki tysiač zabitych i ranienych prakanali i Lihu Narodaŭ, što heta nia žart Musolinija — dyktatara Italii, a sapraŭdy taki wajna. I Rada Lihi Narodaŭ pryznała, što ŭ Afrycy miž Italijaj i Abisynijaj pačałasia wajna i što ŭ hetaj wajnie Italija źjaŭlajecca toj staranoj, što napadaje, a Abisynija—što baronicca.

Hetkaje stanowišča Lihi Narodaŭ wielmi mocna abciažwaje pałažeńnie Italii, i kali Anhlija z Francyjaj ščyra woźmucca baranić mir na świecie, to Italii ŭ Afrycy sapraŭdy moža być „horača." — Kali Lihaj Narodaŭ buduć zastasawany sankcyi adnosna Italii, i Anhlija nia puścić italijanskich karabloŭ praz Suez i Hibrałtar, abisynčyki ŭ Afrycy ad italijancaŭ abaroniacca sami.

I sapraŭdy, Liha Narodaŭ (čytaj Anhlija i Francyja) maje ciapier wialikuju i ciažkuju palityčnuju zadaču, ad udatnaba wyrašeńnia katoraj zaležyć mir i ŭ Eŭropie. Bo kali Liha Narodaŭ nia spynić wajennaha pachodu italijanskaha dyktatara Musolinija ŭ Afryku, dyk tady śmialej budzie rychtawacca na ŭschod Eŭropy i niamiecki dyktatar Hitler.

Niamieckija imknieńni i prociŭniamiecki front u Eŭropie.

Zdaŭnych u niamieckaj palitycy było i jość imknieńnie na ŭschod — naŭpierad praz pabiarežža Bałtyckaha mora i ŭhłyb Rasiei. Hetaje imknieńnie niemcaŭ ciapierašni dyktatar Niamieččyny Hitler uzbudziŭ ŭžo wielmi wostra — ciapier hetym imknieńniem žywie i sam hitleryzm u Niamieččynie.

Słowam, plany swaje hitleryzm pašyraje i pahłyblaje i konsekwentna da ich aslahnieńnia prakładaje ŭ Eŭropie palityčnyja ślachi. A hetyja ślachi jduć, pradusim, pa bałtyckim pabiarežžy na poŭnačy i pa eŭrapejskim paŭdni.

Niamieččyna z Polščaj u sajuzie. Polšč u dobrych i pryjaznych adnosinach z Madziarščynaj. Ciapier Madziarščyna nawiazwaje pryjaznyja adnosiny z Niamieččynaj. — Niadaŭna madziarski premjer byŭ u Niamieččynie na... paławańni. Heta było palityčnaje „paławańnie." Hazety padajuć, što ŭžo miž Niamieččynaj, Polščaj i Madziarščynaj zakłučany latunski dahawor. Kali-b sapraŭdy paŭstaŭ ciesny sajuz Niamieččyny, Polščy i Madziarščyny, dyk u siaredniaj Eŭropie jon byŭby hrozny eŭrapejskamu ŭschodu i nie bajaŭsia-b zachodu. Woś žaŭ suproć hetaha, Sawiety pačali šukać darohi ŭ Čechasławaččynu, kab bližej padstupicca da Niamieččyny i hetak razam z Francyjaj paraližawać niamieckija imknieńni. Sawiety zakłučyli z Rumynijaj wajenny sajuz, pawodle jakoha sawieckaja armija moža prajści praz Rumyniju ŭ Čechasławaččynu; z Čechasławaččynaj Sawiety hetaki wajenny sajuz tak-ža zakłučyli.

Kali woźmiem pad uwahu abaronnaje stanowišča sajuzu bałtyckich dziaržaŭ — Litwy, Łatwii i Estonii, dyk i prociŭniamiecki front stanowicca šyroki i mocny.

Słowam, hetyja sajuzy, pakty i ŭsialakija palityčnyja fronty pakazwajuć, što ŭ mižnarodnaj palitycy dziaržaŭnyja suadnosiny napružanyja i treba mocnaj mižździaržaŭnaj arhanizacyi, jakoj „musiła-b być Liha Narodaŭ, kab mahła spynić wajennyja pachody wajaŭnicza nastrojenych dziaržaŭ.

Ci zdoleje heta zrabić ciotka Liha, — pabačym na sprawie italjanska-abisynskaj.

Roznyja wiestki

Z HAZET.

„Poprostu" ŭ endeckich akularach. Niadaŭna pačała ŭ Wilni wychodzić polskaja hazeta „Poprostu" (litaraturna - hramadzki dwutydniowik). U sprawach socyjalnych heta hazeta pakazałasia „lewaj" — pastupowaj, a ŭ sprawach narodnych — ambitna nacyjanalna-polskaja.

Ad pieršaha numaru „Poprostu" (wyjšła ŭžo 5 numaroŭ) źmiaščaje artykuły ab „biełaruskaj sprawie" i drukuje „biełaruskija" wieršy—(wierš „Wieciar" — Nr. 3 „Poprostu",—nadrukawany chiba tolki dziela taho, kab aśmiejwać sučasnuju biełaruskuju litaraturnuju twornaść). Što datyča artykułaŭ ab „biełaruskaj sprawie," to byli dawoli dobryja, jakimi aŭtary starajucca swaim polskim čytačam pracierci endeckija akulary ŭ pahladach na biełarusaŭ. Ale woś źjaŭlajecca ŭ Nr 5 hetaha časapisu artykuł p. Ordy ab „biełaruskaj sprawie," z jakoha widać, što „Poprostu" nia skidaje endeckich akularaŭ u pahladach na biełarusaŭ. Hety abaronca biełaruskaj sprawy ŭ „Poprostu" nijak nia moža zdecydawana pryznać Biełarusaŭ narodam i pačynajučy ad „jak heta daŭniej bywała" dachodzić da wywadu, što biełarusy — heta „ludnaść našych ziem wschodnich."

Słowam, polski nacyjanalizm i polskim „radykałam" u „Poprostu" zasłaniaje zrok u pahladach na Biełarusaŭ.

Z POLŠČY.

Sojm i Senat. U minułym tydni adbyłasia pieršaja sesija Sojmu i Senatu — wybrali maršałkaŭ i wicemaršałkaŭ abiedźwiuch pałataŭ, pryniali rehulamin, jaki rożnicca ŭ mnohim ad rehulaminu papiarednaha, bo pašyraje kompetencyi maršałka i robić jaho amal nie parlamantarnym dyk-

---

Kab pazbycca hetaha padziełu, niekatoryja dziejačy padawali i padajuć prajekt relihijnaj unii. Ale treba pryznać, što hety prajekt, prawodžany daŭniej i ciapier rukami čužyncaŭ, jakija na unii chacieli zrabić dla siabie palityčnuju rabotu, u sučasnaści zbankrutawaŭ całkom. Astałosia tolki hetym prajektam strašyć jak prawasłaŭnych tak i katalikoŭ i jašče bolej pahłyblać relihijnuju nienawiść i padzieł u našym narodzie — i zatym hety prajekt adkidajecca ciapier badaj usimi biełaruskimi dziejačami.

Što datyča treciaha kirunku, jaki byŭ padniaty na bačynach „Iskraŭ Skaryny", to my hladzim na jaho, jak na niejkuju sektu, jakaja budzie padobnaj da roznych baptystaŭ, metadystaŭ, daślednikaŭ św. Pisańnia (badačoŭ), duchaboraŭ i inšych. Dla nas jasna, što hety kirunak nie abojmie ŭsich biełarusaŭ, nia staniecca ahulna-biełaruskaj relihijaj, a budzie niejkim śmiešnym paklanieńniem pryrodzie. Ludzi buduć hladzieć z naśmiachańniem na hetaje „paklanieńnie", tak jak ciapier hladziać na „chrost" baptystaŭ u rečkach. Dyk nie dla abjadnańnia prywiała-b hetaja forma relihijnaha kultu, ale da jašče bolšaha razjadańnia biełaruskaha narodu. Pry ŭsim hetym chočam spytacca redakcyi „Iskraŭ Skaryny", jakuju maje suwiaź hety prajekt z Skarynaj? Ci-ž Skaryna choć adnym słaŭcom dzie zaachwočwaŭ biełarusaŭ da adkidańnia chryścijanstwa, a pierajmańnia narodnych relihijnych tradycyjaŭ? A kali nie, dyk našto ŭ wusny Skaryny kłaści swoj prajekt i swaje plany? Bo kali Skaryna byŭ i prawasłaŭnym i katalikom, to nie adnačasowa, a kali i schilaŭsia da tahočasnych reformistyčnych tendencyjaŭ, to napeŭna nia ŭ kirunku narodnych, pieražytych užo, wierawańniaŭ, ale ŭ kirunku modnych tady liberalnych i protestanckich tendencyjaŭ. Kali hetakija tendencyi majuć na mecie „Iskry Skaryny", to treba skazać praŭdu, što jany z imi spaźnilisia na jakija 400 hadoŭ! Urešcie, što datyča samoha Skaryny, to sprawa jahonych relihijnych prakanańniaŭ jašče nie daśledawana i čakaje na nawukowyja daśledy.

Dyk adkidajučy i heny, treci, kirunak—što-ž my dadziom z swajho boku? My wysoŭwajem tut **čaćwierty** kirunak, jaki my ŭžo niekalki razoŭ prapanawali našym čytačom: niachaj prawasłaŭnyja biełarusy astanucca prawasłaŭnymi i niachaj pracujuć dla Biełarusi; z druhoha boku niachaj kataliki astanucca katalikami i taksama niachaj pracujuć dla Biełarusi. Prawasłaŭnyja niachaj imknucca da źbiełaruščańnia carkwy, a kataliki — kaściola; u sprawach relihijnych kožnaje wierawyznańnie niachaj ustrajwajecca jak choča, (jasnaja reč, što pry hetym nie wykłučajecca ŭzajemnaja pamoč, kali hetaha akažacca patreba). U ahulna-narodnych biełaruskich sprawach jak kataliki tak i prawasłaŭnyja pawinny iści razam. Dziela hetaha my pieraŭsim pracziwimsia ŭsiakim dalejšym padzielam biełaruskaha narodu na relihijnyja sekty, bo dawoli ŭžo padziełu na prawasłaŭnych i katalikoŭ; skažam bolej: taho biełarusa, jaki pamahaje pašyreńniu ŭ biełaruskim narodzie sektanctwa, my ŭważajem za škodnika dla biełaruskaj sprawy. A čamu? Raz — što jon skiroŭwaje biełaruskuju enerhiju da zmahańnia z biełarusami, a druhoje — što jon pahłyblaje i množyć u narodzie padzieł. Dziela hetych pryčyn treba adkinuć prajekt „Iskraŭ Skaryny" stwareńnia niejkaj „biełaruskaj" relihii, choć-by nawat pad widam biełaruskaha (ci jak chočuć „Iskry") „skaryninskaha" chryścijanstwa.

Z adnym tolki zhadžajemsia z Prahaj, što relihijny padzieł biełarusaŭ jość adnej z najbolšych balačak i pieraškodaŭ u adradžeńskaj padarožy. Padzieł hety byŭ zrobleny čužyncami, ale nastolki ŭjeŭsia ŭ dušu i kroŭ našaha narodu, što biełarusy prawasłaŭnyja (nawat intelihienty) časta nie razumiejuć biełarusaŭ-katalikoŭ, i naadwarot, biełarusy kataliki nie razumiejuć biełarusaŭ prawasłaŭnych. Hetaje sumnaje źjawišča my možam bačyć nia tolki na wioscy, pasiarod niaświedamaj masy, ale i ŭ horadzie, dzie biełaruskija intelihienty prawasłaŭnyja čujucca dalokimi ad katalickich, a katalickija ad prawasłaŭnych! Dyk niaŭžo katalictwa i prawasłaŭje padzialila dušu biełaruskuju? Kali tak, to treba pryzadumacca nad budučynaj katalictwa i prawasłaŭja ŭ našym krai i pastawić pytańnie, što z imi rabić: ci pakinuć, tak jak jość, ci dać im naležny kirunak? My staim za toje, kab ich zrefarmawać u tym kirunku, kab jany nia škodzili narodu našamu i nie dzialili jaho, heta značyć, —ich **zbiełaruščyć**. A świedamaja i rašučaja wola narodu, pamima ŭsich pieraškodaŭ, heta moža zrabić.

Blizki.

(D. b.)

tataram. Na hetym pieršyja narady nowaha parlamantu zakončylisia.

Maršałkam Sojmu wybrany pas. Car — hałoŭny twarec sučasnaj kanstytucyi, a maršałkam Senatu wybrany sen. Prystar —pałkoŭnik, b. premjer u h. zw. paślamajskich uradach.

Abieh hrašej paniżajecca. U 1931 h. u Polščy było 32.100.000 nasielnictwa; na adnaho čaławieka prypadała tady 45 zł. 45 hroš. U 1934 h. užo na adnaho čaławieka prypadała tolki 40 zł. 87 hroš.

Z ZAHRANICY.

Z wajennaha frontu ŭ Afrycy. U Abisynii ciačekroŭ. Italijanski dyktatar choča zawajawać Abisyniju i zrabić z jaje italijanskuju kalonlju. Italijanskija araplany skidajuć da abisyncaŭ adozwy, kab jany paddalisia italijancam, a Italija ŭstanowić u ich taki ład, što ŭsim budzie dobra. Abisyncy hetkich adozwaŭ nia słuchajuć i zaŭziata baroniać swaju niezaležnuju dziaržawu.

Na froncie wajny nia tolki italijancy bjuć abisyncaŭ, bjuć dobra i abisyncy italijancaŭ; u niekatorych miascoch ńawat abisyncy pabiwajuć; a heta-ž z italijanskim wojskam wajujuć abisynskija pryhraničnyja wajskowyja addzieły, bo armija rehularnaja na front jašče nie dajšła — tam čyhunak niama, dyk woziać usio mułami. Abisyncy wajujuć žorstka i bajoŭ nie bajacca. Adna hazeta padaje: italijanski wajenny addzieł (180 čaławiek) pad Adigrat papaŭ u abisynskuju zasadzku. Pašla zajadłaha boju 8 italijancaŭ z aficeram papalisia ŭ plen. Italijancy swaich ludziej z plenu nijak nie mahli adbić. Na druhi dzień znašli hetych plennych za 30 kilam. ad miesca bitwy. Čatyroch z ich jašče byli żywyja. Usim im byli abrezany prawyja dałoni i stupni, a tak-ža zroblena ŭsim žorstkaja operacyja — pazbawili ich mužčynskaści. Na hrudziach aficera była pryčeplena kartačka z napisam—što hetkaja dola budzie kožnaha najezdnika na Abisyniju.

Balšawiki waročajucca da starych rasiejskich čynoŭ. Balšawiki padymajučy ŭ Rasiei rewalucyju kasawali ŭsio staroje, kab pašla nasadžawać swajo nowaje. U hetym „rewalucyjnym" razhonie skasawali tak-ža wajennyja i administracyjnyja čyny. Ciapier užo waročajucca nazad i nanowa ŭstanaŭlajuć čyny ŭ wojsku — ad paručnika aż da hienerała i maršała, a tak-ža ŭstanaŭlajuć čyny ŭ administracyi. Słowam, u Sawietach patrochu prybližajucca balšawiki da staroha carskaha ładu —ciapier wonkawym wyhladam, formaj, a dalej i źmiest prytasujecca stary.

Z KRAJU.

Sud za bićcio ŭ palicyi. Nadowiačy adbyŭsia ŭ Wilni Apelacyjny Sud nad 3 b. tajnikami — palicejskimi śledčaj palicyi ŭ Lidzie. Usich troch u pieršaj instancyi Akružny Sud zasudziŭ — daŭ pa hodu turmy — za toje, što jany bili padčas daprosu ludziej i hetak wymušali pakazańni. Apelacyjny sud razhladzieŭšy sprawu b. „syščykaŭ" Br. Śpileŭskaha i Baz. Laškiewiča zasudziŭ pa 2 hady turmy, a Jana Dembinskaha na hod turmy.

Hety prysud śćwierdziŭ, što ŭ palicyi bili ludziej i wymušali pakazańni.

Пісьмы з вёскі

„Каапэратыўны дзень".

Рачканы, Ляхавіцкае воласьці, Баранавіцкага пав. У 1931 годзе паўстала ў нас спажывецкая каапэратыва, імя якой „Рунь". Каапэратыва ў нас добра разьвіваецца. Сяляне нашае вёскі, таксама і суседніх, у большасьці зацікаўленыя сваей каапэратыўнай пляцоўкай; праўда, ёсьць людзі і анты-каапэратыўныя. Вялікі падрыў нашай каапэратыве зрабілі зладзеі ў 1933 годзе — абакралі яе на 600 злотых, а так-жа нясумленныя крамнікі, якія „здэфраўдавалі" 100 злотых. Паміма усякіх падрываў і перашкодаў з боку антыкаапэратыўных адзінак, ідзём бадзёра, поўныя веры ў перамогу, наперад.

Дня 30 чэрвеня сёлета наша каапэратыва ладзіла „Каапэратыўны дзень." Праграма гэтага дня была такая: 1) інсцэнізацыя каапэратыўнае моладзі — „Усе да нас", 2) Рэфэрат кіраўніка каапэратывы А. Патаповіча —„Каапэрацыя і каапэратыўны дзень," 3) Супольная фатаграфія учасьнікаў „дня", 4) Спартовыя спаборніцтвы; 5) Спэктакль—з праграмай: а) „Для бліжніх" — 4-х актовая драма каапэратыўнага зьместу; б) „Мікітаў лапаць" — ведамая ўсім камэдыя, і б) Скокі.

У працягу „дня" дэклямавалі беларускія вершы, а школьная каапэратыўная моладзь выканала інсцэнізацыю „Усе да нас" папольску.

Яшчэ загадзя ўся ваколіца гаманіла і цікавілася гэтым днём. Усе кругом пыталіся, ці „дзень" будзе выкананы пабеларуску, а пачуўшы адказ, што так, абяцалі прыйсьці цэлымі вёскамі. Управа каапэратывы прадбачыўшы вялікі лік гасьцей выбрала найбольшае ў вёсцы гумно, якое—прыгожа ўбранае зеляняй і плякатамі — зусім зьмяніла выгляд і было пышнай заляй. Навет прадстаўнік улады, які быў прысутны, заявіў: „Ня можна паверыць, што гэта гумно". У 2 гадзіны па палудні 30 чэрвеня пачалася ўрачыстасьць. Народу было больш 300 асоб. Месцы былі перапоўненыя. Учасьнікі выслухалі рэфэрат, зрабілі супольную фатаграфію і пашлі на пляц дзеля спартовых спаборніцтваў. Там адбыліся: а) бег удаль 100 мэтраў, б) скок узвыш; ц) скок удаль. Шэсьць асоб дасталі за здабытыя першыя месцы ў спаборніцтве нагароды таварамі з каапэратыўнае крамы. Найбольш усіх цікавіў спэктакль. Артысты-каапэратары пад кіраўніцтвам А. Патаповіча многа папрацавалі, каб добра адыграць сваё ролі. Пастаноўка была надта добрая. Народ выяўляў здаваленьне пляскамі ў далоні, а дэкляматара вершу Купалы «Лапці" аж да канца ўрачыстасьці народ вітаў выражаючы здаволеньне. Прысутныя былі пераважна з вёскі, дзе існуюць каапэратывы, бо трэба адзначыць, што нашая воласьць ужо добра скаапэратызаваная. Ёсьць 8 спажывецкіх каапэратываў і 2 малачарні. Жыхары нацыянальна сьведамыя і з вялікай ахвотай вітаюць усё беларускае. Каапэратывамі кіруюць беларусы, і дзеля гэтага яны добра разьвіваюцца. Нічога дзіўнага, што сабралася так шмат народу, каб адсьвяткаваць свой беларускі — каапэратыўны „дзень", і разам пабыць на беларускім спэктаклі. Наша моладзь ходзіць за дзесяткі кілёмэтраў, — калі дзе пачуе аб бел. спэктаклю.

Дык вось, які быў у нас „каапэратыўны дзень". Гэткі дадатні сэнс маюць усе беларускія імпрэзы, бо людзі да свайго горнуцца, бо лепш свая будка, як чужая хатка.

Грамадзяне! Усе злучайцеся ў каапэрацыю. Тварэце свае беларускія каапэратывы. Дайце належны адпор усім няпрошаным апякуном у асобах Шантэраў, Вышамірскіх, Хацяноўскіх і інш. В—к.

Беларускі Адрыўны Календар на 1936 год

ужо выйшаў з друку і прадаецца ўсюды!

Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў.

Хто купляе большы лік, атрымлівае зьніжку.

Зьмест календара багаты і размавіты.

Dentystyčny kabinet

pry lakarni Litoŭskaha T-wa Sanit. Pomačy ŭ Wilni, wul. Ad. Mickiewiča № 33-a, telef. 17-77.

Pryniaćcie štodzienna, aproč świat: ad 10—12 hadz. dnia.

Plambawańnie, wyrywańnie i lačeńnie zuboŭ, a tak-ža štučnyja zuby.

Ceny — ambulansaŭ dziaržaŭnych uradoŭcaŭ.

Dr. Stanisłaŭ i dr. Jadwiha Hrynkiewičy.

Chwaroby prafesyjanalnyja.

Prafesyjaju zawiem hałoŭnuju i daŭžej trywajučuju dziejnaść čaławieka, tuju jahonuju pracu, u jakoj jon źjaŭlajecca adumysłoŭcam i jakoju jon zarablaje na žyćcio. Pobač swajej prafesyi, kožny čaławiek, jasna, moža zajmacca roznymi inšymi rabotami, jakija adnak nia buduć užo hałoŭnymi krynicami jahonych dachodaŭ.

Prafesyjanalnaju chwarobaju budzie takaja, jakaja wyklikajecca tolki henaju daŭžej trywajučaju pracaju čaławieka.

Prafesyi mohuć być roznajakija — zdabywańnie syroha mataryjału (ziemlaroby, harakopy, laśniki, drewasieki i inš.), abrablańnie syroha mataryjału (promysieł sa swaimi šmatlikimi halinami dziejnaści), raździeł abroblenych ci nat' syrych pradmietaŭ (handal, kamunikacyja, transport). Jość prafesyi, jakija zawucca *wolnymi,* dzie praca nia budzie fizyčnaju a umysłowaju (daktatary, adwakaty i h. d.

U pracy fizyčnaj čaławiek sustrakajecca z mašynami, wytworčymi pryładami i pradmietami takimi, jak syry mataryjał, poŭfabrykaty, fabrykaty, adpadki. Dalej nia treba zabywacca, što čaławiek pracuje ŭ zusim aznačanym miescy, značycca maje swajo *asiarodzišča* pracy i heta ŭ sensie maralnym i fizyčnym, kali majem na ŭwiecie pamieškańnie, światło, jakaść padłohi i h. d. Usie hetyja pasobnyja dziejniki mohuć mieć bolšy ci mienšy ŭpłyŭ na zdaroŭje. Kab lahčej ujawić heta, padumajem, što nat' adnyja ruchi fizyčnyja mohuć wyklikać adchiły ad normy ŭ krywachodnaj systemie, kali henyja ruchi trywajuć daŭžej i wymahajuć bolšaje natuhi.

Adnastajnaja, daŭžej trywajučaja praca całaha cieła ci asobnaha orhanu tolki, — zaležna ad pazycyi — moža wyklikać chwarobu. Wytworčyja mašyny ci prylady mohuć paškodzić cieła i wyklikać roznajakija kalectwy. Nikatoryja substancyi majuć užo samyja cieraz siabie škodnaje dziejańnie na arhanizm čaławieka, prykładam woława, žywoje sierabro, fosfar, arsen. Zusim zrazumieła, što asiarodzišča, dzie čaławiek pracuje, moža škodzić zdaroŭju, prykładam nadta wialikaja haračynia ŭ pradpryjemstwach metalurhičnych, u hutach, ci znoŭ naadwarot — zališnie wialiki choład ci pieramieny ciaplini, dalej wialikaja wohkaść atmasfery, šmat pyłu, roznyja hazy, niedachop ci zašmat światła. Dyk wywad z wyšejskazanaha prosty: — jość nadta roznajakija mamenty, jakija mohuć paškodzić zdaroŭju.

Chwaroby zaležnyja ad prafesyi možna padzialić na takija, dzie jość *biezpasiaredni* ŭpłyŭ na zdaroŭje čaławieka,—prykładam atručańnie takimi substancyjami, z jakimi čaławiek, aprača pracesu fabrykacyi, nidzie nia sustreniecca. Ad čaści da henaje katehoryi naležacimuć i nieščaśliwyja wypadki, kali ich nazywacimiem prafesyjanalnymi chwarobami. Siudy naležacimie zaražeńnie personału ŭ lakarniach, dzie lažać chworyja zaraznyja.

Ab *pasiarednym* upływie niejkaje prafesyi kažam tady, kali čaławiek maje spadkabiernickuju swomaść da chwaroby, prykładam da suchotaŭ ci da blizkazročnaści, a ŭmowy jahonaje prafesyi spryčyniajucca da taho, što chwaroba henaja maje mahčymaść chutčej prajawicca. Woźmiem np. čaławieka, jaki skłonny da suchotaŭ, baćki jakoha chwareli na suchoty ci ŭ chacie niechta mieŭ henuju chwarobu, a jon pačnie pracawać u suchoj, zapylenaj atmasfery za šlifiera ci kamienščyka ci harakopa abo ŭradoŭca, dyk takija ŭmowy pracy mohuć wyklikać raźwićcio chwaroby a nat' dawiaści da śmierci. Kali-b heny čaławiek wybraŭ sabie inšuju prafesyju, u zdarawiejšym asiarodziščy — u lesie, na ralli, u harodnictwie — dyk tam nia było-b henych *spahadajučych* dziela chwaroby ŭmowaŭ.

Niezaležna ad umowaŭ samoje prafesyjanalnaje pracy, šmat mohuć tyja abstawiny hygijeničnyja, u jakich žywie adzinka. Henyja ŭmowy mohuć zrabić jaho mienš adpornym i jon zachwareje, kali adnačasna jaho siabra budzie zdarowym, dziakujučy tamu, što žywie ŭ chacie bolš hygijenična. Da henych umowaŭ hygijeničnych naležać—u pieršuju čarhu — pamieškańnie, wopratka, adžyŭleńnie, chwaroby weneryčnyja, na jakija kožny čaławiek moža zachwareć, budowa cieła i h. d.

Ahulna dzielać pracu na try *katehoryi:* 1) chatniaja praca (kala swajej haspadarki), 2) lohkaja zarabkowaja praca i 3) ciažkaja zarabkowaja praca.

Chatniuju pracu robić najčaściej žančyna. Ab hetaj pracy i jejnych paśledkach na zdaroŭje hawaryli my ŭžo ŭ raździele ab žanočych chwarobach. Jašče raz tolki možam padčyrknuć, što chatniaja praca škodzić tolki tady, kali žančyna spaŭniaje swaje abawiazki ŭ błahich umowach hrašowych i kiepskich hygijeničnych abstawinach.

Da *druhoje katehoryi* naleža pracaŭradoŭcaŭ, usich pracaŭnikoŭ kantoraŭ, bankaŭ, kasaŭ, praca wučycialoŭ, mašynistak, kraŭcoŭ, modystak i h. d. Ab pracaŭnikach hetaje katehoryi kažuć, što majuć jany „*lohki chleb*". Tyja, što tak kažuć, miarkujuć najbolš ab tym, što henaja praca byccam najlahčejšaja, nie patrabuje fizyčnaje natuhi. Pahlad na „lohkaść" henaje pracy zusim adnak pamyłkowy, dziela taho, što treba tutaka časta wialikaje natuhi intelektualnaje, henaja praca wykonywajecca amal nie zaŭsiody ŭ ciesnych pamiaščeńniach, najčaściej u pazycyi sohnutaj.

Hetaja katehoryja pracy dawoli časta pakidaje błahija śledamki na zdaroŭi ludziej. Da taho-ž pry siańniašnim ładzie socyjalnym hetaja katehoryja wielmi časta błaha apłačywajecca. Dyk nia tolki ludzi tutaka pracujuć u błahich hygijeničnych umowach, a da taho — jany nia mohuć paprawić sabie žyćcia na što dzień u chacie. Da *treciaje katehoryi* pracy naležać pracaŭniki fizyčnyja. Tutaka nia mienš časta bačym błahija śledamki pracy, jak u papiaredniaj katehoryi. Dawoli padumać, što pojdzie da raboty chłapiec ci dziaŭčyna nie daśpieŭšy fizyčna. Biazumoŭna, arhanizm nia maje tady narmalnych umowaŭ dziela swajho razwoju. Stul padchaplajucca da hetkich adzinak i chwaroby, jakija abniadužywajuć cieła; abniadužany arhanizm znoŭ nia moža, jak śled, zmahacca z chwarobaju i niahodnymi ŭmowami, i hetak robicca miortwaje koła, z jakoha anijak nia wyjści. Inspektaraty achowy pracy nahladajuć za tym, kab nie dapuścić da hetkich źjawiščaŭ, nažal časta samyja zacikaŭlenyja imknucca abmanuć baroniačyja ich zakony, dziela taho, što chatniaja halita prynukaje ich da taho, kab zaniacca pa mahčymaści jak najchutčej zarobkami.

Našyja biełaruskija ŭmowy na ščaście, prynamsia ŭ henaj halinie, dawoli ščaśliwyja. Bolšaść našaha narodu — heta sialanstwa, jakoje sprakonwiakoŭ maje swaju praktyku, swaju higijenu, wysnawanaju z pradziedaŭskich dośledaŭ i spaściarohaŭ. Nia chočam skazać hetym, što ŭ nas užo ŭsieńka ŭ henaj halinie nadta dobra. Heta daloka nia tak! Adnak niama tutaka tych sapraŭdy niemahčymych źjawiščaŭ, jakija nahladajem pa fabrykach, pa majsterniach. Kali ŭ nas ŭletku ludzi ad zarnicy da ciomnaha sutunku pracujuć, dyk zatoje heta praca na sonku, na świežym pawietry, na prawiewie.

Dziakujučy woś henamu zdarowamu ahułam asiarodziščy pracy, nie nahladajecca hetak časta takich chwarobaŭ, jakija tutaka byli-by mahčymy, zważajučy na našyja izby, na našuju ježu.

Chočučy, kab sapraŭdy žyćcio mieła dziela nas nia tolki zaŭsiody swaje błahija storany, kab jano nam pakazała swajo charastwo, treba być zdarowym, a chočučy być zdarowym, treba imknucca, prynamsia na skolki heta mahčyma, realizawać tyja zahady, ab jakich woś i haworycca ŭ hetaj knižycy.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič